Мароз С. С., Ржавуцкая М. С. (Мінск, Беларусь)

СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ ПАСЕСІЎНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ: СІНТЭТЫЧНЫ СПОСАБ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Як шматаспектнае моўнае адзінства, катэгорыя пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове фарміруецца рознаўзроўневымі моўнымі сродкамі. Такія адзінствы ў мовазнаўстве атрымалі назву «функцыянальна-семантычных катэгорый» (ФСК). Граматычны статус названых катэгорый і па сёння абсалютна дакладна не акрэслены. Аднак большасць даследчыкаў трактуюць ФСК толькі як катэгорыі моўныя, якія маюць моўны змест і моўнае выражэнне. У большасці такіх катэгорый цэнтрам выражэння паняцця выступае аналагічная граматычная катэгорыя: у аснове ФСК тэмпаральнасці – граматычная катэгорыя часу дзеяслова, у ФСК персанальнасці – граматычная катэгорыя асобы займенніка і дзеяслова і інш. Да іх адносіцца і катэгорыя пасесіўнасці – універсальная моўная з'ява, што характарызуецца сістэмнасцю ў сваім выражэнні. Як функцыянальна-семантычная катэгорыя, пасесіўнасць (possessio – валоданне, прыналежнасць) у сучаснай беларускай літаратурнай мове мае багаты змест і разнастайныя сродкі выражэння. Звычайна пасесіўнасць разумеецца як катэгорыя, «связывающая два объекта внеязыковой действительности таким отношением (r), при котором один из них (объект обладания, или объект посессивности R) является в известном смысле частью другого (посессора, или субъекта посессивности Ps)» [1, с. 192–193]. Цэнтрамі поліцэнтрычнай катэгорыі пасесіўнасці выступаюць граматычныя катэгорыі прыналежных займеннікаў і прыналежных прыметнікаў, дзеясловаў са значэннем пасесіўнасці і інш. Разнастайнасць сродкаў выражэння паняцця пасесіўнасці абумоўлівае і наяўнасць розных спосабаў яго рэпрэзентацыі: пасесіўнасць можа быць выражана сінтэтычным, аналітычным і змешаным (гібрыдным) спосабамі.

Аналізуючы спосабы выражэння пасесіўнасці, даследчыкі, як правіла, засяроджваюць увагу менавіта не на спосабах, а на тыпах выражэння пасесіўнага значэння, у прыватнасці, называюцца і даследуюцца асаблівасці займеннікавых прыналежных канструкцый, назоўнікавых прыналежных канструкцый, прыметнікавых прыналежных канструкцый і дзеяслоўных прыналежных канструкцый [2, с. 1–6].

Агульнавядома, што спосаб – прыём, метад ажыццяўлення, дасягнення чаго-небудзь. Спосабы выражэння граматычных значэнняў – прыёмы, сродкі, з дапамогай якіх утвараюцца новыя формы слова; спосабы ўтварэння граматычных форм.

Спосаб выражэння граматычнага значэння, як вядома, ляжыць у аснове тыпалагічнай класіфікацыі моў. У сінтэтычных мовах (лацінскай, польскай, фінскай і інш.) усе граматычныя значэнні перадаюцца пераважна з дапамогай марфем (у структуры слова). У аналітычных мовах (англійскай, французскай, балгарскай і інш.) усе граматычныя значэнні перадаюцца пераважна за межамі слова (у сказе), пры дапамозе парадку слоў, службовых адзінак і інтанацыі.

Мэта артыкула – устанавіць і ахарактарызаваць моўныя сродкі, якія рэпрэзентуюць сінтэтычны спосаб выражэння пасесіўнага значэння ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Беларускую мову традыцыйна адносяць да сінтэтычных моў, паколькі граматычныя і некаторыя іншыя значэнні выражаюцца з дапамогай марфем, уключаных у структуру слова (канчаткаў, прыставак, суфіксаў).

Аналіз сабранага і апрацаванага матэрыялу пераконвае, што паняцце пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове можа перадавацца як каранёвымі, так і некаранёвымі марфемамі.

Назіранні над ілюстрацыямі паказваюць , што сінтэтычны спосаб выражэння пасесіўнасці рэпрэзентуюць моўныя адзінкі, якія перадаюць пасесіўнае значэнне

(значэнне прыналежнасці і значэнне валодання) лексічна, усёй асновай (вытворнай ці невытворнай). Да іх адносяцца:

– займеннікі са значэннем пасесіўнасці (свой, мой, твой, наш, ваш, ягоны, іхні, нечы, абы-чый, чый-небудзь і пад.): Ты помніш, як маці цябе твая родная дзень першы ў лапці абула… (Я. Купала); ... мая ўзнёсласць і мая рашучасць уступаюць месца роспачнай злой безвыходнасці (В. Быкаў); І менавіта яны [наўгародцы] не жадалі мець сваім князем Брачыслава (М. Ермаловіч); ... *раптам, знячэўку, пашанцавала* ягонай сястры (Я. Брыль); Нечая добрая душа ... *кінула гранату* (М. Лынькоў); Грушы былі нічыйныя (А. Марціновіч);
– прыметнікі (якасныя) са значэннем пасесіўнасці (асабісты, уласны, чужы і пад.): Шкада было старога котлішча і цесных закуткаў уласнага дворыка… (Я. Колас); Можа, таму ў Ленькі такое абвостранае адчуванне да чужога болю («Полымя»); Успомню родныя загоны… (Я. Колас);
– дзеясловы са значэннем пасесіўнасці (негатыўнай і пазітыўнай, статычнай і дынамічнай) (валодаць, мець, належаць, прыдбаць, прадаць, купіць, згубіць, страціць і пад.): У гэтай пушчы з перадвекаў ... сялібу меў сабе Машэка… (Я. Купала); З гэтага часу сем тысяч сем'яў, якія належалі асабіста яму і маці, … павінны быць плаціць аброк (У. Караткевіч);
– назоўнікі са значэннем пасесіўнасці, у тым ліку тэрміны роднасці і сваяцтва (гаспадар, гаспадыня, уласнік, уласніца, валоданне, маёмасць, уласнасць; бацька, маці, сын і пад.): Завязаўшы хустку яна [Ганна] падзякавала гаспадыні, гаспадару... (І. Мележ); [Заслаўе] пабудавана ў канцы 10 ст. кіеўскім князем Уладзімірам Святаслававічам і аддадзена ва ўласнасць жонцы Рагнедзе і сыну Ізяславу (БелСЭ); ... *рабы былі* ўласнасцю свайго гаспадара, рабаўладальніка (БелСЭ); І піша Пятрусь Малец, што гэта – пляменніку яго…(Я. Брыль); Наш дзядуля Мікалай Васільевіч надзейна трымае ў руках плуг («Народная газета»); Але нават цяпер … я ўспамінаю цёплае, ласкавае слова – дачушка (В. Бялова).

Семантычнайя структура названых лексічных сродкаў характарызуецца наяўнасцю агульных інтэгральных пасесіўных сем 'валодаць', 'мець', 'належаць', 'быць (з'яўляцца, станавіцца) уладальнікам', 'быць (з'яўляцца, станавіцца) уласнасцю', 'пераставаць быць (з'яўляцца, станавіцца) уласнасцю', 'пераставаць быць (з'яўляцца, станавіцца) уладальнікам і пад. Пасесіўны сэнс ва ўсіх пералічаных адзінках утрымліваецца ў семантыцы слоў цалкам.

Аналіз фактычнага матэрыялу сведчыць, што сінтэтычны спосаб выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове рэпрэзентаваны наступнымі некаранёвымі марфемамі:

– суфіксамі прыналежных і некаторых адносных прыметнікаў (-аў, -еў, -оў, -ёў; -ін, -ын; нулявы суфікс (з чаргаваннем дз:дж, к:ч у аснове), -ач, -эч, -оч; -оў-ск, -эр-ск, ын-ск): Сыракомлева Барэўкаўшчына адсюль кіламетраў шэсць… (К. Цвірка); У хаце пахла аўчынамі, зайцовымі шкуркамі… (М. Лынькоў); Удаўцова і ўдавінае сэрца, як зімовае сонца, а малайцовае і дзявоцкае, як летняе сонца (Прыказка); Забаўкай было і хлопцам узяць вужа на вячэрнія пасядзелкі, падпусціць у дзявочы гурток (І. Мележ); Вецер, які мацнеў, прынёс аднекль здалёк воўчае выццё (М. Лынькоў); Самому Сцёпку паказалася смешным папоўскае здзіўленне… (Я. Колас); Качалаўскі Пушкін свяціў і сагграваў, нібы сонечныя прамяні («Маладосць»);
– суфіксамі асабовых назоўнікаў (жаночага і мужчынскага роду), што абазначаюць сваяцкую прыналежнасць (-іх (-ых), -оўн (-аўн, -еўн), -эўн, -н, нулявы суфікс, -ыц, -ышн; -овіч, -евіч (-эвіч), -юк, -аддзюк): Свацця стала вуглоўская Сымоніха… (Я. Брыль); Як на шчасце, паявілася леснікоўна (І. Мележ); [Янка:] – Каму падабаецца поп, каму пападдзя, а каму папова дачка (Я. Колас);Упершыню княжыч не адчуваў да суперніка злосці… (В. Іпатава);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– прыстаўкай без- (бес-, бяс-) у канфіксальных назоўніках і прыметніках са значэннем негатыўнай прыналежнасці (адсутнасці чаго-небудзь ва ўладальніка): Сам паліцай быў трусаваты…, а яго [Сцёпку], бязбацькавіча, … якраз і прыгледзеў на гэтую справу (В. Быкаў); Былі і бязвусыя хлопцы (Я. Колас); Калі сям'я была бяздзетная, уся яе маёмасць пераходзіла да сваякоў («Этнаграфія Беларусі»); … не дарэмна так сціснуты былі бяскроўныя губы ў Зайчыхі (І. Мележ); Бязрукія паказвалі свай голае калецтва… (К. Чорны);
– злучальнай галоснай у складаных назоўніках і прыметніках са значэннем неадчужальнай прыналежнасці: На калёсах сядзела белагаловае, малое зусім хлапчаня (І. Пташнікаў); Вастраносая дзяўчына адышлася ад акна (К. Чорны); Высокі, чорнавалосы ён [настаўнік] увайшоў у клас павольнай, размеранай паходкай (І. Навуменка); А над імі [буслянятамі] на адной назе стаяў чарнакрылы і чорнагаловы з белай грудкай стары бусел (Т. Хадкевіч).

Пасесіўная семантыка выражаецца менавіта пералічанымі марфемамі. На думку А. Я. Міхневіча, «ні сінтэтызм, ні аналітызм не сустракаюцца як абсалютная якасць той ці іншай мовы. Таму больш правільна … разглядаць тыпы аналітычных структур, якія размяркоўваюцца ў кожнай канкрэтнай мове ў адпаведнасці са спецыфікай яе ладу» [3, с. 487].

Такім чынам, сінтэтычны спосаб выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове рэпрэзентаваны і каранёвымі, і некаранёвымі марфемамі. Выбар пэўнага канкрэтнага сродку залежыць ад задач камунікацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Головачева, А. В. К вопросу о соотношении категории отчуждаемости и определенности / А. В. Головачева // Славянское и балканское языкознание. Проблемы диалектологии. Категория посессивности. – М., 1986. – С. 192–193.
2. Притяжательность (посессивность) и способы ее выражения / А. В. Головачева [и др.] // Структура текста – 81 : тезисы симпозиума. Институт славяноведения и балканистики АН СССР. – М., 1981. – С. 1–6.
3. Міхневіч, А. Я. Сінтэтызм і аналітызм / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : энцыкл. ; пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (агал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 487.

Мельнікава Т. М. (Мінск, Беларусь),
Пажыдаева Н. В. (Чэрыкаў, Беларусь)

ТЭМАТЫЧНАЕ І СТРУКТУРНАЕ АДМЕЖАВАННІ К ПСІХАЛІНГВІСТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ У ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ МАКСІМА ТАНКА

Аднымі з актуальных пытанняў псіхалінгвістыкі з'яўляецца выкарыстанне мовы для перадачы сэнсу, аптымальны выбар моўнай формы ў залежнасці ад мэт і ўмоў зносін, правільнае распазнаванне сэнсу паведамлення. Паэтычны тэкст – гэта функцыянальна-эстэтычная сістэма са сваімі прыкметамі (камплетыўнасцю, эксперыментальнасцю, герметычнасцю, рэпрадуктыўнасцю, суцэльнааформленасцю, ідыяматычнасцю, энергетычнасцю) і высокім узроўнем фармалізацыі (метр, рытм, рыфма, страфа і г.д.).

Творчасць Максіма Танка характарызуецца наяўнасцю паэтычных тэкстаў з глыбокім варыятыўным разуменнем. Яны будуюцца на вядомых у псіхалінгвістыцы прынцыпах складнасці і цэльнасці. Ядзерная цэласць паэтычных тэкстаў пісьменніка адлюстроўваецца ў наборы ключавых слоў. Так, любоў да радзімы ў вершы «Зноў я на тых сцежках» з кнігі «Дарога, закалыханая жытам» завецца «казачнай сілай, / Без якой бы гэта пушча не гула, / Без якой і ў песні не ўзняліся б крылы, / Без якой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ